Новы час

11.04.2018

# Мы – таксама друкары, або Першы буквар у свеце

Аляксей Хадыка

Багатая гісторыя культуры нашай краіны адкрывае шырокай публіцы ўсё новыя імёны, раней вядомыя пераважна спецыялістам. Хто ж такі Спірыдон Собаль?



*Выданні Спірыдона Собаля*

«Новы Час», як вядома, не толькі інтэрнэт-выданне, але і друкаванае (падпісвайцеся)! Таму абмінуць адкрыццё камернай, але густоўна зробленай выставы «Беларускі друкар

Спірыдон Собаль» у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ў Мінску 10 красавіка нам не выпадала.

Тым больш, што і рабілі яе, не шкадуючы намаганняў, адразу некалькі ўстановаў: апрача гаспадароў пляцоўкі — Музей гісторыі Магілёва, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я.Коласа НАН Беларусі і Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.




*Радавод Спірыдона Собаля*

Багатая гісторыя культуры нашай краіны адкрывае шырокай публіцы ўсё новыя імёны (раней вядомыя пераважна спецыялістам). І, як сказаў на адкрыцці дырэктар Інстытута

літаратуры НАН Беларусі доктар навук **Іван Саверчанка**, хаця маскоўскія цары ды іх памагатыя скралі ў Беларусі ды вывезлі амаль усе культурныя каштоўнасці, яны паступова вяртаюцца ў Беларусь.




*Іван Саверчанка*

Як і шыкоўныя выданні **Спірыдона Собаля**, некаторыя з якіх літаральна ў мінулым годзе былі закупленыя з аўкцыёнаў для Магілёўскага музея і Нацыянальнай бібліятэкі. Частка вернецца (альбо вярнулася), як падкрэсліў Іван Саверчанка, у электронным выглядзе і праз інтэрнэт — што, магчыма, яшчэ зручней. Гэта важна, бо, па словах дырэктара Магілёўскага музея **Аляксея Бацюкова**, Спірыдон Собаль — па ўзроўні Стыў Джобс ці Біл Гейтс свайго часу.

Прынамсі, выдатны асветнік, дадаў кіраўнік Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі **Алесь Суша**.



*Алесь Суша*

Хто ж такі Спірыдон Собаль? Адукатар і арыстакрат, сын бурмістра Магілёва. У пачатку XVII стагоддзя — настаўнік, потым рэктар Магілёўскай брацкай школы. З 1624 года, перабраўшыся ў Кіеў, у слаўную Кіева-магілянскую акадэмію, настаўнічаў і там. А з 1628 года пачаў друкарскую працу, выдаўшы некалькі кніг маральна-павучальнага зместу.

Але цягнула на радзіму. Вярнуўся ў Беларусь, і ў 1630 годзе пад Воршай, у Куцейнскім манастыры, заклаў друкарню. Там у 1631 годзе выдаў «**Букварь сиречь, начало учения детем, начинающим чтению извыкати**». Упершыню ў славянскіх мовах ужыўшы слова «буквар».



*Бард і супрацоунік музея Андрэй Мельнікаў каля твораў у гонар Собаля*

А былі яшчэ слоўнікі-«азбукі» («лінгваэнцыклапедыі»), рэлігійныя выданні («Часасловы» ды іншыя). Трохі пазней запачаткаваў «выдавецкі дом» у Буйнічах блізу роднага Магілёва.


Новы
ЧАС
ONLINE

*Выданні Спірыдона Собаля*

З большасцю пладоў творчага і асветнага шляху Собаля, з яго радаводам, з працай асветніка, нашага калегі, і з мастацкімі творамі ў яго гонар і знаёміць выстава.

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры

***Фота аўтара***